


# АДЗІНСТВА МІРУ І ЗГОДЫ

**Грамадска-літаратурная акцыя «Слова яднання» крочыць па навучальных установах г. Гродна. 17 кастрычніка 2024 года ў межах праекта, па ініцыятыве ГрАА СПБ прысвечанага 85-годдзю ўз’яднання беларускіх зямель і 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, гродзенскія пісьменнікі выступілі ў сярэдняй школе № 16 імя А. Сухамбаева.**



Сутнасць акцыі фактычна закладзена ў яе назве. Наша задача – з дапамогай мастацкага слова дастукацца да юных сэрцаў, каб абудзіць дух адзінства і згоды паміж рознымі пакаленнямі, падкрэсліць сакральную ролю памяці пра наша трагічнае мінулае. Каб яно ніколі не паўтарылася. Па запрашэнні настаўніка беларускай мовы і літаратуры гродзенскай 16-й школы Людмілы

Юльеўны Жданюк гутарка на гэтую тэму вялася з вучнямі 10-х і 11-х класаў. Іх гасцямі сталі: старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Людміла Кебіч; члены СПБ, паэтэсы Людміла Шаўчэнка, Кацярына Каламійцава і паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык.

Мір і згода… Пра вечныя, прыярытэтныя каштоўнасці чалавека нагадваюць гістарычныя вехі жыцця краіны – 85-я гадавіна аб'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі, 80 гадоў вызвалення нашай Радзімы ад нямецка-фашысцкай акупацыі. Літаратура ніколі не стаяла ў баку ад гісторыі народа, да канца піла горкую чашу пакут і выпрабаванняў. Спачатку да 17 верасня 1939 года заходнебеларускіх паэтаў пераследвала польская дэфензіва; панскія ўлады знішчалі іх як і апалагетаў беларускай нацыянальнай ідэі, носьбітаў беларускай культуры. Беларускі народ быў пазбаўлены чалавечай годнасці. У гады фашысцкай акупацыі пісьменнікі змагаліся з ворагам у падполлі і партызанскіх атрадах па ўсёй тэрыторыі рэспублікі, гінулі на палях бітваў і ў канц-лагерах.

Памяць пра ліхалецце, боль ад страт і пакут блізкіх жывуць практычна ў кожнай беларускай сям’і. Таму выступленні гасцей былі напоўнены моцнымі сямейнымі матывамі. Кацярына Каламійцава, Людміла Шаўчэнка, Дзмітрый Радзівончык прысвяцілі радкі ўласных твораў сваім родным. Дачка ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Людміла Антонаўна Кебіч прадэкламавала творы патрыятычнай лірыкі, напісаныя паэтэсай да самага маладога дзяржаўнага свята Беларусі – Дня народнага адзінства. Прагучалі імёны паэтаў Пілiпа Пестрака, Максіма Танка, Тодара Кляшторнага, Міхася Васілька, Валянціна Таўлая. Яшчэ адна важная тэма – тэма мацярынства падчас акцыі прагучала актуальна і дзякуючы нядаўняму Дню Маці. Моладзь праявіла ўвагу і гучна апладзіравала выступоўцам. Напрыканцы сустрэчы пісьменнікі па традыцыі падарылі свае кнігі слухачам. Грамадска-літаратурная акцыя «Слова яднання» ў гродзенскай сярэдняй школе № 16 імя А. Сухамбаева пацвердзіла вострую неабходнасць такіх сустрэч. Атмасфера мерапрыемства атрымалася вельмі кранальнай і выклікала шчырае пачуццё ўзрушанасці. Сімвалічна, што школа носіць імя ўдзельніка вызваленчых баёў за наша Прынёманне, Героя Савецкага Саюза, казаха Агадзіла Сухамбаева, які паўтарыў подзвіг Аляксандра Матросава – накрыў амбразуру нямецкага кулямёта сваім целам. Аддаў сваё жыццё за нас, беларусаў. Вось і прыклад інтэрнацыянальнага адзінства савецкага народа. Адзінства, што здолела адстаяць мір.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** падчас грамадска-літаратурнай акцыі ГрАА СПБ «Слова яднання», прысвечанай 85-годдзю ўз’яднання беларускіх зямель і 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Актавая зала Дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 16 імя А. Сухамбаева г. Гродна», 17 кастрычніка 2024 года.




Людміла Кебіч. Прысвячэнні заходнебеларускім паэтам-барацьбітам



Дзмітрый Радзівончык (нарыс пра дзеда-франтавіка, вершы)






Паэтэсы
Кацярына Каламійцава і
Людміла Шаўчэнка





Л. В. Шаўчэнка і Л. Ю. Жданюк




Л. А. Кебіч і Л. Ю. Жданюк







**Фота**
Людмілы Жданюк
і Дзмітрыя Радзівончыка



**Герой Савецкага Саюза Агадзіл Сухамбаеў (1920-1944),**
**казах, які аддаў жыццё за тое, каб мы, беларусы сёння жылі**